# РЭФЕРАТ

Справаздача 62 с., 1 ч., 2 табл., 46 крыніц

ОНІМ, ТАПОНІМ, МІКРАТАПОНІМ, ФІТОНІМ, АФАРЫЗМ, ФРАЗЕАЛАГІЗМ, ЭПІТЭТ, ПАРАЎНАННЕ, БРЭСЦКА-ПІНСКАЕ ПАЛЕССЕ, ФАЛЬКЛОР

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца лексічныя і фразеалагічныя адзінкі ў дыялектным і літаратурным кантэксце.

Мэта працы – вывучэнне спецыфікі лексічных і фразеалагічных адзінак у дыялектным і літаратурным кантэксце.

У працэсе працы выкарыстоўваліся апісальны, супастаўляльны метады, а таксама прыёмы словаўтваральнага і этымалагічнага аналізу.

У выніку даследавання вызначаны спецыфічныя асаблівасці наступных лексічных і фразеалагічных адзінак: айконімаў, гідронімаў Пабужжа, мікратапонімаў Брэстчыны, фітонімаў у кантэксце гаворак Кобрынскага і Іванаўскага раёнаў Брэсцкай вобласці і мастацкіх твораў (на прыкладзе апавяданняў В. Адамчыка), фразеалагізмаў Іванаўскага раёна, эпітэтаў, параўнанняў і рэгіяналізмаў у песеннным фальклоры Брэсцка-Пінскага Палесся, афарызмаў у творах берасцейскіх пісьменнікаў (Г. Марчука, З. Дудзюк, Р. Баравіковай, В. Коўтун, А. Наварыча, А. Крэйдзіча) і моўных адзінак марфалагічнага ўзроўню ў старабеларускім перакладзе "Гісторыі аб Атыле".

У межах груп праведзены лексіка-семантычны, часткова словаўтваральны і этымалагічны аналізы. Вызначаны характэрныя рысы семантыкі лексічных і фразеалагічных адзінак, у якіх зафіксаваны ўнікальны грамадска-культурны вопыт палешукоў, месца дадзеных лексем у сістэме беларускай мовы; акрэслена спецыфіка слова ў мастацкім кантэксце, яго вобразная і эстэтычная значнасць.

Вынікі даследавання маюць важнае значэнне для развіцця некалькіх навуковых напрамкаў – лексікалогіі і фразеалогіі сучаснай беларускай мовы, дыялекталогіі, гісторыі мовы, анамастыкі, тэрміналогіі, лінгвакультуралогіі і лінгвакраязнаўства; для тэарэтычнай і практычнай распрацоўкі пытанняў унутрымоўнага ўзаемадзеяння; для вывучэння семантыкі моўнай адзінкі ў кантэксце.

Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца пры чытанні лекцый па дыялекталогіі, сучаснай беларускай мове, гістарычнай граматыцы, на спецыялізацыях, пры напісанні дыпломных і курсавых прац на філалагічным факультэце ВНУ.

Вынікі даследавання апублікаваны ў выглядзе навуковых артыкулаў. Яны прайшлі апрабацыю на міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навуковых канферэнцыях. Атрыманы 4 акты ўкаранення ў вучэбны працэс.